**Дзве малпы Брэйгеля**

Жахлівы мой сон перад школьным іспытам:
дзве малпы ў вакне, скаваныя ланцугамі,
а за імі лунае неба,
і плешчацца мора.

Здаю гісторыю чалавецтва.
Запінаюся і мямлю.

Адна малпа слухае іранічна
другая нібыта прыснула —
але калі я змаўкаю,
падказвае
ціхім дзвэнканнем ланцуга.

**Катаванні**

Як было, засталося.
Хваравітае цела
павінна есці, дыхаць і спаць,
у яго тонкая скура і кроў пад ёю,
ладны запас зубоў і пазногцяў,
ломкія косці, расцяжныя суставы.
Усё гэта ўлічваецца пры катаваннях.

Як было, засталося.
Цела дрыжыць, як дрыжэла
да і пасля заснавання Рыму,
у дваццатым стагоддзі да і пасля Хрыста,
і катаванні тыя ж, толькі змалела зямля
і ўвесь час адбываецца штосьці,
нібы за сцяной.

Як было, засталося.
адно людзей паболела,
старыя грахі адсунуліся дзеля новых —
бясспрэчных, пераканаўчых, імгненных, ніякіх,
але крык, якім цела расплочваецца за іх
быў, ёсць і будзе крыкам невінаватасці,
паводле спрадвечнай шкалы і рэестру.

Як было, засталося.
Змяніліся толькі манеры, абрады і танцы.
Ды парыў засланіць рукамі аблічча,
застаўся тым самым.
Цела круціцца, торгаецца, выдзіраецца,
падае, збітае з ног, падгінае калені,
пухне, сінее, заходзіцца слінай і сцякае крывёй.

Як было, засталося.

Апрача плыні рэк, лясоў, узбярэжжаў,
пустэльняў, ледавікоў.
Тут душа-небарака блукае, знікае,
вяртаецца, набліжаецца, аддаляецца,
чужая сама сабе, няўлоўная,
упэўненая і няўпэўненая ў сваім існаванні,
а цела тымчасам жыве, і жыве, і жыве
і не знае куды падзецца.

**Канец і пачатак**

Пасля кожнай вайны
нехта павінен прыбрацца.
Сякі-такі парадак
не зробіцца сам сабой.

Нехта павінен паспіхваць друз
з дарогі на ўзобычну,
каб праехаць маглі
машыны, поўныя трупаў.

Нехта павінен грузнуць
у попеле ды парэштках,
спружынах канапаў,
аскепках шкла
і крывавых анучах.

Нехта павінен падперці
бэлькай сцяну,
нехта зашкліць вакно
і дзверы ўздзець на завесы.

Гэта гледзіцца не эфектна
і часу шмат вымагае.
Усе фотакамеры з’ехалі
яшчэ на адну вайну.

Патрэбны новыя шляхі,
масты, чыгункі, вакзалы.
І лахманамі стануць
ад закасвання рукавы.

Хтосьці з мятлою ў руках
успамінае былое.
Іншы, слухаючы, хітае
яшчэ неадарванай галавой.
Але паблізу ўжо круцяцца тыя
каму гэта будзе нудна.

Хтосьці часам яшчэ
выцягне з-пад карчэўя

іржой паедзеныя аргументы
і занясе іх на сметнік.

Тыя, каму вядома,
пра што гаворка,
мусяць вызваліць месца для тых,
хто ведае мала.
І меней, чым мала.
І тым, хто нічога не ведае.

У траве, якая пакрыла
прычыны і вынікі,
нехта павінен ляжаць
з каласком у зубах
і пазіраць на хмары.

**Музей**

Талеркі ёсць, ды неахвота есці,
Ёсць шлюбныя пярсцёнкі, ды няма ўзаемнасці —
ужо гадоў пад трыста.

Клінкі, куды ваш гнеў падзеўся?
І вахлік ёсць, а дзе румянец?
І лютня голас не падасць гадзінай шарай.

Тут стосы старадаўніх рэчаў
грувасціла гадамі вечнасць.
Сівы наглядчык спіць нявінна,
шчаку паклаўшы на вітрыну.

Металы, гліна, лён праходзяць,
трыумфам ціхім праз стагоддзі.
Гігоча толькі шпілька рагатушкі з Егіпту.

Перажыла чало карона.
Далонь прайграла рукавіцы.
І правы бот нагу адолеў.

Што да мяне, жыву, не дбаю.
І з сукняй доўжу барацьбу.
Яна ж згінаецца ў дугу —
Так перажыць мяне жадае.

**Вакзал**

Непрыезд мой у горад N.
быў пунктуальным.

Я цябе папярэдзіла
неадасланым лістом.

Ты паспеў не прыйсці
у прызначаны час.

Цягнік прыбыў да трэцяй платформы,
павыходзіла шмат людзей.

І таўклася ў гэтым натоўпе
мая адсутнасць.

Колькі цётак з задавальненнем
замянілі мяне
ў гэтым тлуме.

Да адной падышоў
Хтосьці мне невядомы,
але яна адразу
яго пазнала.

Яны абмяняліся
пацалункам не нашым,
тымчасам ляснулася
не мая валізка.

Вакзал у горадзе N
з адзнакай здаў іспыт
на аб’ектыўнасць свайго існавання.

Суцэльнасць стаяла на месцы
І рухаліся драбніцы
сваім парадкам.

Адбылася нават
дамоўленая сустрэча.

За мяжою
нашай прысутнасці.

У страчаным раі
імавернасці.

Недзе там.
Недзе там.
Як звіняць гэтыя слоўцы.

## Хмары

Варта было б паспяшацца
з апісаннем хмараў,
бо праз імгненне
сыдзе гэтая, прыйдзе другая.

Іх асаблівасць —
ніколі не паўтарацца
ні формай, ні колерам, ні будовай.

Яны ўзносяцца над падзеямі,
і ўспаміны ім не замінаюць.

І хіба яны могуць сведчыць пра штосьці,
разлятаючыся над светам.

Калі з хмарамі параўнаць,
жыццё падаецца стабільным,
амаль трывалым і бадай што вечным.

Побач з імі
нават камень здаецца братам,
на якога можна паспадзявацца,
яны ж — далёкія пужлівыя пляменніцы.

Хай людзі жывуць, калі хочуць,
а потым кожны ў сваю часіну сканае.
Што хмарам з таго?
Далёка й няўцямна.

Над Вечным Табою
і нявечнаю мной
урачыста дэфілююць, як раней дэфілявалі.

Для хмараў паміраць, як мы, няма карысці,
і быць навідавоку для таго, каб плысці.

## Нацюрморт з балонікам

Перад смерцю
замест успамінаў
замаўляю вяртанне
страчаных рэчаў.

Хай ціснуцца ў вокны і дзверы
парасоны, валізкі, пальчаткі,
каб я прамовіць магла:
Нашто мне ўсё гэта.

Зашпількі, грэбень той і гэты,

нож, матузок, папяровая ружа,
каб я прамовіць магла:
мне не шкада нічога.

Дзе б ні ляжаў ты, ключык,
пастарайся з’явіцца ўчасна,
каб я прамовіць магла:
Саржавеў ты, дружа, саржавеў.

Наваліцца хмара папераў,
пропускаў і анкетаў,
каб я прамовіць магла:
Сонца заходзіць.

Усплыві, гадзіннік, з ракі,
І не знікай, калі ласка, з рукі,
каб я прамовіць магла:
Не тая гадз*і*на.

І ты, балонік, прыляціш,
пашкуматаны ветрам,
каб я прамовіць магла:
Дзяцей тут няма.

Ляці праз вакно,
злятай у шырокі свет,
хай нехта ўсклікне: О!
каб я заплакала.